Будаванне супольнасці праз супрацоўніцтва

Аўтар: Кацярына Паўлоўская
21.11.2021 00:00



Людзі, а не сцены будынка, у першую чаргу з’яўляюцца парафіяй. Супольнасць ствараюць асобы. Так адбываецца, калі мы з’яўляемся не толькі атрымальнікамі, але і ўдзельнікамі. Аб узаемадзеянні пробашча і касцёльнага камітэта мы пагаварылі з пробашчам парафіі св. Яна Паўла II у Смаргоні кс. Яўгенам Учкуронісам.
†

– Кс. Яўген, як у Вашай парафіі пабудавана супрацоўніцтва паміж святаром і касцёльным камітэтам? Гэта фармальнае фарміраванне?

– Нічога звышнатуральнага няма. Згодна з правам кананічным, у Статуце кожнай супольнасці павінен быць прапісаны орган кіравання – парафіяльны камітэт, альбо лепш назваць Рада.

У нашу Раду ўваходзіць 15 чалавек. Сярод іх ёсць і старшыня, і скарбнік, і рэвізійная камісія, да абавязкаў якой належыць, між іншым, правядзенне інвентарызацыі, запіс набытых рэчаў у гэты пералік. Ёсць яшчэ адказны за пытанні літургічнага характару, за арганізацыю паездак, і асоба, якая займаецца парафіяльнай картатэкай. Калі б усё было фармальна, то навошта гэта рабіць, з якой мэтай?

Зразумела, што ёсць біскупам вызначаны святар, які адказвае за ўсю парафію, за душпастырства. Важна адзначыць, гаворачы аб нейкай структуры, што заданне Езуса Хрыста ісці і навучаць усе народы (параўн. Мц 28, 19) застаецца нязменным і для

кожнага святара павінна быць прыярытэтным. Я спадзяюся, што так і ёсць. У гэтым сэнс.

Душпастырская дзейнасць, арганізацыя духоўнага жыцця – гэта аснова асноў. Яна заўсёды была для мяне на першым месцы, дзе б я ні быў. Нават не важна, што касцёл будуецца і забірае шмат часу ў святара. Калі ў парафію прыязджаю, то першае, што арганізую, – г. зв. “духоўнае кармленне”, не ад адной акцыі да другой, а сістэматычна. Сюды адносіцца перадусім арганізацыя катэхезы, падрыхтоўкі да вянчання, хрышчэння, да сакрамантаў для дарослых. Для мяне вельмі важна, каб сталыя людзі таксама вывучалі Біблію і Катэхізіс Каталіцкага Касцёла, таму ёсць біблейская група, ёсць моладзевая група, а таксама ўсе астатнія духоўныя суполкі, як і ў іншых парафіях. У Статуце агульна прапісана, што парафія пад кіраваннем пробашча, назначанага біскупам, арганізуе дзейнасць, накіраваную на распаўсюджванне каталіцкага веравызнання і духоўнае ўмацаванне парафіян.

Ужо пасля неабходна склікаць структуры, якія ясна рэгламентуюцца пэўнымі пунктамі, для таго, каб было камфортна даносіць узгаданыя духоўныя каштоўнасці.

У кантэксце гэтага парафіяльны камітэт для майго служэння ў парафіі вельмі важны, у тым ліку як дарадчыкі, якія дапамагаюць прымаць рашэнні.

– Якая іх роля?

– З невялікай групай на чале са старшынёй Рады мы бачымся нават некалькі разоў на тыдзень. Кожны дзень абмяркоўваем пытанні, якія датычаць будаўніцтва касцёла: напрыклад, дакументы падпісаць, закупіць будаўнічыя матэрыялы...

Поўны склад Рады некалькі разоў на год збіраецца. Звычайна перад Раством, Вялікаднем, перад такімі падзеямі, як Першая св. Камунія, канфірмацыя, а таксама перад нашым парафіяльным святам, 22 кастрычніка. Абмяркоўваем арганізацыйныя моманты і абавязкі, якія ёсць амаль у кожнага з нас: хтосьці адказвае за працэсію, за падрыхтоўку ўсяго неабходнага да ўрачыстай літургіі, хтосьці – за пачастунак для гасцей.

Акрамя гэтага, у Рады ёсць абавязак калегіяльнага абмеркавання розных момантаў. Адным з іх быў удзел парафіян у будаванні касцёла. Лічу, што такія пытанні трэба вырашаць менавіта калегіяльна, таму што ўзвядзенне святыні з’яўляецца нашым сумесным заданнем. Пасля дыскусій і выказвання сваіх меркаванняў Рада прыняла рашэнне, а я агучыў яго падчас парафіяльных аб’яў на нядзельнай св. Імшы. Таксама мы раіліся пры ўсталяванні поручняў у нашую капліцу.

Аўтар: Кацярына Паўлоўская
21.11.2021 00:00

